# Зялёныя гарады

Беларусь – краіна з высокім узроўнем урбанізацыі. У 115 гарадах пражывае больш за 78% насельніцтва краіны, і паводле гэтага паказніку Беларусь знаходзіцца на 48 месцы са 195 дзяржаў па ўзроўні ўрбанізацыі. Рост канкурэнцыі паміж гарадамі за прыцягненне чалавечых рэсурсаў і інвестыцый ставіць перад імі мноства складаных задач па забеспячэнні высокай якасці жыцця і інфраструктуры, і адначасоваму зніжэнню ўздзеяння на навакольнае асяроддзе.

Паводле дадзеных экалагічнага бюлетэня «Стан навакольнага асяроддзя Беларусі», за 2022 г. найбольшае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе аказваюць:

- Выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра. У 2021 г. выкіды ад аўтатранспарту (512 тыс. тон) больш як у 3 разы перавышалі выкіды ад перапрацоўчай прамысловасці (155,9 тыс. тон).
- Скіды сцёкавых вод. Паводле звестак дзяржаўнага воднага кадастра ў 2020 г. у паверхневыя водныя аб'екты скінута 1034,5 млн. $м^3$ сцёкавых вод.
- Утварэнне, перапрацоўка і захаванне адходаў вытворчасці і спажывання. У 2017-2021 гг. колькасць адходаў прамысловасці, што ўтвараюцца штогод, павялічылася на 12,14%.

Сярод праблем эксперты таксама адзначаюць узровень азелянення тэрыторый гарадоў. Большая частка беларускіх гарадоў, у адпаведнасці з нацыянальнымі стандартамі, дасягнула ўзроўню азелянення звыш 40%, пры гэтым узровень даступнасці зялёных зон застаецца даволі нізкім.

## *Чаму беларускія гарады трэба зрабіць больш зялёнымі?*

1. Забруджванне паветра, вады і глебы негатыўна адбіваецца на якасці навакольнага асяроддзя і жыцця ў горадзе, аказвае **негатыўнае ўздзеянне на здароўе гараджан**.
2. **Састарэлая інфраструктура** і нізкі ўзровень выкарыстання зялёных тэхналогій і падыходаў у сферы кіравання гарадской інфраструктурай павялічваюць нагрузку на бюджэты беларускіх гарадоў і хатніх гаспадарак.
3. Беларускія гарады адстаюць ад еўрапейскіх гарадоў па ўзроўні і колькасці ўкаранення кліматычных праектаў, што робіць іх больш **уразлівымі да рызыкі, звязанай са змяненнем клімату** – хвалямі спякоты і холаду, паводкам, засухам, пажарам.
4. Укараненне праектаў па мадэрнізацыі гарадскога кіравання і інфраструктуры створыць спрыяльныя ўмовы для **стварэння новых працоўных месцаў і эканамічнага росту**.

Мінпрыроды штогод складае Рэйтынг экалагічнага развіцця рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь, які шмат у чым грунтуецца на метадалогіі планавання зялёных гарадоў.

> ***Што такое зялёны горад?*** *Зялёнымі называюць гарады, стратэгіі развіцця і сістэма кіравання ў якіх накіраваныя на памяншэнне ўздзеяння на прыродныя рэсурсы, захаванне экасістэм і біяразнастайнасці, павышэнне ўстойлівасці да рызыкі, звязанай са зменай клімату.*

Дзякуючы зялёным тэхналогіям і перадавым падыходам да кіравання, горады, забяспечваюць сваю ўстойлівасць, эфектыўнасць інфраструктуры і павышэнне ўзроўню жыцця грамадзян.

Гарады Беларусі маюць досвед укаранення падыходаў зялёнага горада ў рамках міжнародных праектаў. Пры падтрымцы ЕС 56 гарадоў сталі ўдзельнікамі Глабальнага пагаднення мэраў па клімаце і энергіі. Мінск удзельнічаў у праграме "Зялёныя гарады" ЕБРР, яшчэ каля 20 гарадоў – у праекце ГЭФ "Падтрымка зялёнага горадабудаўніцтва ў малых і сярэдніх гарадах Беларусі". На жаль, пасля 2020 г. міжнародныя праекты па тэматыцы зялёных гарадоў у Беларусі не ажыццяўляюцца, практычна спынілася супраца з ЕС, ЕБРР, ГЭФ, ПРААН.

## Карысць для беларусаў

Чыстае паветра і вада, больш месцаў для адпачынку палепшаць здароўе і якасць жыцця гараджан. Горад стане больш бяспечным і камфортным для жыцця дзякуючы змене транспартнай інфраструктуры і гарадскога планавання. Будуць створаныя зялёныя працоўныя месцы ў энергетыцы, будаўніцтве, вытворчасці, сектары паслуг, перапрацоўцы адходаў, гарадскім планаванні, азеляненні, добраўпарадкаванні, кіраванні, адукацыі.

## Як зрабіць зялёнымі беларускія гарады?

Палітыка гарадскога развіцця павінна грунтавацца на прынцыпах зялёнага горада, распрацоўвацца і рэалізоўвацца сумесна шырокім колам зацікаўленых бакоў.

| Мэта | Практычная рэалізацыя |
|---|---|
| **1. Развіваць патэнцыял гарадоў** | |
| - Прасоўванне падыходаў зялёнага горада<br>- Павышэнне якасці гарадскога кіравання<br>- Забеспячэнне эфектыўнасці інвестыцый<br>- Развіццё міжнароднай супрацы | Рэфармаваць мясцовае самакіраванне з улікам зялёнага развіцця<br>- Укараняць падыходы зялёнага горада ў гарадскім планаванні, гарадскіх стратэгіях і сектаральных планах<br>- Сінхранізаваць гарадскія стратэгіі з палітыкай ў галіне энергіі, вады, транспарту, прамысловасці і тд.<br>- Павышаць кваліфікацыі гарадскіх уладаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў<br>- Аказваць тэхнічную падтрымку гарадскім уладам і арганізацыям камунальнай гаспадаркі па ўкараненні праектаў зялёнага развіцця<br>- Стварыць Зялёны банк для акумулявання міжнароднага фінансавання і рэалізацыі зялёных праектаў у гарадах<br>- Далучацца да міжнародных ініцыятываў: Зялёныя гарады, Глабальнае пагадненне мэраў, Гарады за біяразнастайнасць і да т.п. |
| **2. Інвеставаць у зялёную інфраструктуру** | |
| Замена выкапнёвага паліва **чыстай энергіяй** | - Укараняць у гарадах энергаэфектыўныя тэхналогіі і АКЭ: сонечныя і ветраныя электрастанцыі, геліякалектары, цеплавыя помпы<br>- Прыняць гарадскія стандарты па закупцы энергіі з АКЭ<br>- Ствараць энергетычныя кааператывы з удзелам жыхароў горада |
| Стварэнне сістэмы **ўстойлівай мабільнасці** | - Распрацаваць планы ўстойлівай гарадской мабільнасці<br>- Мадэрнізаваць грамадскі транспарт<br>- Выкарыстоўваць больш экалагічны транспарт і паліва<br>- Развіваць малую мабільнасць: самакаты, скутары, пешаходныя зоны |
| Развіццё **зялёнай прамысловасці** | - Ствараць экапрамысловыя паркі<br>- Прыцягваць інвестыцыі для ўкаранення зялёных тэхналогій<br>- Падтрымліваць цыркулярныя бізнес-мадэлі |
| Стварэнне эфектыўнай сістэмы **кіравання адходамі** | - Укараняць практыку  прадухілення ўтварэння адходаў<br>- Развіваць сістэму сартавання камунальных адходаў насельніцтвам<br>- Развіваць сістэму паўторнага выкарыстання і перапрацоўкі адходаў |
| Павышэнне **рэсурсаэфектыўнасці будынкаў** | - Рэнавацаваць будынкі для павышэння энергаэфектыўнасці<br>- Увесці энергапашпарты для будынкаў<br>- Вызначыць зялёныя стандарты для будаўніцтва новых дамоў |
| Паляпшэнне кіравання **воднымі рэсурсамі** | - Мадэрнізаваць станцыі водазабеспячэння, сістэмы водаадвядзення<br>- Развіваць аб'екты блакітнай інфраструктуры ў гарадах |
| Сучаснае **гарадское планаванне** | - Укараняць нормы зялёнага горадабудаўніцтва<br>- Пашыраць плошчу, разнастайнасць і даступнасць зялёных зон<br>- Развіваць разумныя сеткі ў транспарце, энергетыцы, асвятленні |
| **Адаптацыя да змены клімату** | - Распрацаваць планы адаптацыі да кліматычных змен<br>- Павялічыць плошчы гарадскога азелянення і водных аб'ектаў<br>- Стварыць сістэму падтрымкі ўразлівых груп |
| Здаровае **харчовае асяроддзе** | - Арганізаваць фермерскія рынкі, гарадскія агароды і сады<br>- Змяняць харчовыя звычкі, кампаставаць харчовыя адходы |

### *Крыніцы фінансавання рэформы*

Імавернымі крыніцамі фінансавання стануць нацыянальны і мясцовыя бюджэты, крэдыты міжнародных фінансавых арганізацый (Сусветны Банк, ЕБРР, ЕІБ) і праграмы тэхнічнай дапамогі (ГЭФ, ПРААН, ЕС), інвестыцыі кампаній.

*Аўтары: Іван Шчадранок, Аляксандра Мамаева*
*Падрыхтавана CASE у супрацы з Эканамічнай камандай Офіса Святланы Ціханоўскай пры фінансавай падтрымцы MATRA*